ДУК “Бібліятэчная сетка Хоцімскага раёна”
Дзіцячая бібліятэка-філіял






# АСВЕТНІКІ ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ




Віртуальная выстава

З глыбокай старажытнасці
дайшло да нас жыватворнае
слова роднай мовы.
Праз стагоддзі і цяжкія
выпрабаванні данеслі яго
нашчадкам выдатныя асветнікі і
творцы, якія аб’ядноўвалі народ
магутнай сілай, вучылі
размаўляць, спяваць песні,
складаць вершы пра шчасце і
волю на роднай мове. Сапраўды,
нам ёсць што ўзгадаць,
нам ёсць чым ганарыцца.
У нашай краіне заўсёды
шанавалі друкаванае слова.
Беларускае кнігадрукаванне мае
больш чым 500-гадовую
гісторыю.

**Прапануем вашай увазе
літаратуру аб беларускіх
асветніках з фонду дзіцячай
бібліятэкі.**




**Асветнікі зямлі Беларускай : X — пачатак XX ст. Энцыклапедычны даведнік / рэдкалегія : Г. П. Пашкоў і [інш.] ; мастак У. М. Жук. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2006. — 496 с. : іл.**

У кнізе змешчаны матэрыялы пра жыццёвы і творчы шлях каля 750 прадстаўнікоў філасофскай і грамадскай думкі Беларусі ад старажытных часоў да пачатку 20 стагоддзя. Сярод іх дзяржаўныя, грамадска-палітычныя і рэлігійныя дзеячы, філосафы і педагогі, пісьменнікі і мастакі, кампазітары і музыканты, выдаўцы і бібліятэкары, прыродазнаўцы, падарожнікі і краязнаўцы, незалежна ад нацыянальнай прыналежнасці, грамадскай пазіцыі і светапогляду.

Выданне разлічана на навукоўцаў, студэнтаў і навучэнцаў, усіх тых, хто цікавіцца пытаннямі гісторыі, развіцця грамадскай думкі і асветы на Беларусі.







**Гісторыя беларускай кнігі : у 2 т. / пад агульнай рэдакцыяй М. В. Нікалаева. — Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя Пятруся Броўкі, 2009. — Т. 1 : Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага / М. В. Нікалаеў. — 2009. — 424 с. : іл.**

Першы том прысвечаны кніжнай культуры Вялікага Княства Літоўскага за ўвесь перыяд існавання гэтай дзяржавы. Шматлікія ілюстрацыі паказваюць эвалюцыю мастацкай аздобы беларускай кнігі. Кніга будзе карыснай для студэнтаў і выкладчыкаў ВНУ, гісторыкаў, філолагаў, краязнаўцаў, усіх, хто цікавіцца пытаннямі гісторыі беларускай культуры.

**Гісторыя беларускай кнігі : у 2 т. / пад агульнай рэдакцыяй М. В. Нікалаева. — Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя Пятруся Броўкі, 2009. — Т. 2 : Кніжнасць новай Беларусі (XIX–XXI стст.) / М. В. Нікалаеў [і інш. ; навуковыя рэдактары : В. В. Антонаў, М. В. Нікалаеў ; мастак Г. І. Мацур]. — 2011. — 436 с.**

Другі том прысвечаны беларускай кніжнай культуры ад часу ўваходжання Беларусі ў склад Расійскай імперыі да нашых дзён. Шматлікія ілюстрацыі паказваюць эвалюцыю мастацкай аздобы беларускай кнігі. Кніга будзе карыснай для студэнтаў, выкладчыкаў ВНУ, гісторыкаў, філолагаў, краязнаўцаў, усіх, хто цікавіцца пытаннямі гісторыі беларускай культуры.




**Дождзікава, Р. Н. Асветнікі Беларусі. Мікола Гусоўскі, Сімяон Полацкі, Афанасій Філіповіч / Р. Н. Дождзікава. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2017. — 72 с. : іл. — (Ганаруся табой, Беларусь!).**

У кнізе распавядаецца пра жыццёвы шлях, светапогляд і шматгранную асветніцкую дзейнасць трох асветнікаў 15–17 стагоддзяў — лацінамоўнага паэта Міколу Гусоўскага (каля 1470–1533), царкоўнаславянскага паэта Сімяона Полацкага (1629–1680) і праваслаўнага царкоўнага дзеяча і пісьменніка Афанасія Філіповіча (каля 1597–1648), якія, нягледзячы на розніцу ў культурна-рэлігійных і філасофскіх поглядах, унеслі значны ўклад у развіццё пісьменнасці і кніжных ведаў на беларускіх землях і пазнаёмілі жыхароў Заходняй Еўропы і Расіі са сваёй радзімай.




**Дубянецкі, Э. С. Асветнікі Беларусі. Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Францыск Скарына / Э. С. Дубянецкі. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2016. — 72 с. : іл. — (Ганаруся табой, Беларусь!).**

У кнізе ў папулярнай форме апавядаецца пра жыццёвы шлях, светапогляд і шматгранную асветніцкую дзейнасць хрысціянскай падзвіжніцы, ігуменіі манастыра Святога Спаса ў Полацку Ефрасінні Полацкай, багаслова, царкоўнага пісьменніка, епіскапа Кірылы Тураўскага і беларускага, усходнеславянскага першадрукара, культурнага дзеяча, мысліцеля-гуманіста Францыска Скарыны.




**Дубянецкі, Э. С. Асветнікі Беларусі. Іван Фёдараў, Пётр Мсціславец, Спірыдон Собаль / Э. С. Дубянецкі. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2018. — 64 с. : іл. — (Ганаруся табой, Беларусь!).**

У кнізе ў папулярнай форме распавядаецца пра жыццёвы шлях, светапогляд і шматгранную выдавецкую і асветніцкую дзейнасць Івана Фёдарава, які выдаў першую друкаваную кнігу на тэрыторыі Расіі і з’яўляецца заснавальнікам кнігадрукавання ў Рассіі і Украіне, беларускага і расійскага друкара і гравёра Пятра Мсціслаўца, які працаваў на тэрыторыі Расіі, Украіны, Літвы, а таксама прадаўжальніка справы Францыска Скарыны Спірыдона Собаля, друкарская справа якога закранала землі Беларусі і Украіны.




**Дубянецкі, Э. С. Асветнікі Беларусі. Казімір Нарбут, Ян Снядэцкі, Анёл Доўгірд / Э. С. Дубянецкі. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2017. — 64 с. : іл. — (Ганаруся табой, Беларусь!).**

У кнізе ў папулярнай форме апавядаецца пра жыццёвы шлях, светапогляд і дзейнасць па прапагандзе навуковых і філасофскіх ведаў эпохі Асветніцтва трох выдатных вучоных Беларусі 18–19 стагоддзяў — Казіміра Нарбута (1738–1807), Яна Снядэцкага (1756–1830) і Анёла Доўгірда (1776–1835). Творчасць асветнікаў разглядаецца на фоне шырокага грамадскага жыцця таго часу.




**Дубянецкі, Э. С. Асветнікі Беларусі. Казімір Семяновіч, Георгій Каніскі, Марцін Пачобут-Адляніцкі / Э. С. Дубянецкі. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2017. — 64 с. : іл. — (Ганаруся табой, Беларусь!).**

У кнізе ў папулярнай форме апавядаецца пра жыццёвы шлях, светапогляд і шматгранную дзейнасць трох айчынных асветнікаў, якія ўнеслі значны ўклад у навуку, матэрыяльную і духоўную культуру – інжынера, тэарэтыка артылерыі і мысліцеля-гуманіста Казіміра Семяновіча, выдатнага пісьменніка, мысліцеля, царкоўнага і грамадскага дзеяча Георгія Каніскага, астранома, матэматыка Марціна Пачобута-Адляніцкага.




**Дубянецкі, Э. С. Асветнікі Беларусі. Лаўрэнцій Зізаній, Мялецій Сматрыцкі, Казімір Лышчынскі / Э. С. Дубянецкі. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2017. — 64 с. : іл. — (Ганаруся табой, Беларусь!).**

У кнізе ў папулярнай форме апавядаецца пра жыццёвы шлях, светапогляд і шматгранную дзейнасць трох асветнікаў 16–17 стагоддзяў — царкоўных пісьменнікаў і філолагаў, аўтараў граматыкі царкоўнаславянскай мовы Лаўрэнція Зізанія і Мялеція Сматрыцкага, а таксама філосафа-атэіста Казіміра Лышчынскага, якія першы на беларускіх землях у навуковым трактаце апісаў матэрыялістычную карціну свету.




**Дубянецкі, Э. С. Асветнікі Беларусі. Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Іпацій Пацей / Э. С. Дубянецкі. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2016. — 72 с. : іл. — (Ганаруся табой, Беларусь!).**

У кнізе ў папулярнай форме распавядаецца пра жыццёвы шлях, светапогляд і шматгранную асветніцкую дзейнасць трох хрысціянскіх асветнікаў 16–17 стагоддзяў, якія, нягледзячы на розніцу ў рэлігійных і філасофскіх поглядах, унеслі значны ўклад у развіццё пісьменнасці і кніжных ведаў на беларускіх землях — пратэстанцкіх дзеячаў, друкароў Сымона Буднага (каля 1530–1593) і Васіля Цяпінскага (каля 1541–каля 1613).




**Дубянецкі, Э. С. Асветнікі Беларусі. Ян Баршчэўскі. Ян Чачот, Ігнат Дамейка / Э. С. Дубянецкі. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2017. — 72 с. : іл. — (Ганаруся табой, Беларусь!).**

У кнізе ў папулярнай форме апавядаецца пра жыццёвы шлях і дзейнасць трох асветнікаў 19 стагоддзя – пісьменнікаў, пачынальнікаў новай беларускай літаратуры, якія ўнеслі значны ўклад у вывучэнне фальклору роднага краю Яна Баршчэўскага (каля 1794–1851) і Яна Чачота (1796–1847), а таксама геолага і натураліста, даследчыка прыроды Чылі Ігната Дамейкі (1802–1889).




**Спірыдон Собаль і вытокі магілёўскага кнігадруку / складальнік А. А. Суша ; фота А. П. Дрыбаса, А. Р. Шаблюка. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2016. — 248 с. : іл.**

Выданне прадстаўляе багатую спадчыну магілёўскага кнігадрукара Спірыдона Собаля і яго паслядоўнікаў 17–18 стст. Народжаны ў Магілёве, ён стаў найбольш вядомым праваслаўным выдаўцом і друкаром Беларусі першай палавіны 17 ст., распачаўшы кнігавыданне ў Куцейне, Буйнічах і ў самім Магілёве. С. Собаль выдаў першы на землях сучаснай Беларусі «Буквар». Ён паспяхова развіваў сваю выдавецкую дзейнасць у Кіеве, а таксама наведаў з мэтай арганізацыі выдавецкай справы Маскву. У кнізе прадстаўлены ўнікальны перыяд магілёўскага кнігадруку праз найбольш яскравыя кніжныя помнікі і лёсы іх стваральнікаў.




**Суша, А. А. Францыск Скарына : у 3 ч. / Алесь Суша. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2016. — Ч. 1 : Чалавек-энцыклапедыя. — А. А. Суша. — 2016. — 120 с. : іл.**

Кніга серыі «Беларуская дзіцячая энцыклапедыя» прысвечана беларускаму першадрукару Францыску Скарыне, які з'яўляецца, верагодна, самым яркім і найбольш вядомым творцам беларускай культуры, здольным прадставіць яе ва ўсёй шматграннасці і паўнаце. Гэта сапраўды чалавек-энцыклапедыя і універсальная асоба. Яго талент праяўляўся літаральна ва ўсім : беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар, выдавец, перакладчык Бібліі на родную мову, пісьменнік, філосаф-гуманіст, тэолаг, вучоны, лекар, батанік, грамадскі дзеяч, прадпрымальнік…




**Узнікненне кнігадрукавання ў Еўропе і Беларусі = Возникновение книгопечатания в Европе и Беларуси = The emergence of book-printing in Europe and Belarus / [І. Я. Вашкевіч і інш. ; складальнік А. А. Суша ; пад навуковай рэдакцыяй Р. С. Матульскага] ; Нацыянальная бібліятэка Беларусі. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя ім. П. Броўкі, 2017. — 151 с.**

Багата ілюстраванае выданне, прысвечанае 500-годдзю беларускага кнігадрукавання, вызначае вытокі і дасягненні еўрапейскага кнігадрукавання, прадстаўляе друкаваную спадчыну Францыска Скарыны ў Беларусі і свеце, паказвае ўплыў першадрукара на развіццё кніжнай культуры Беларусі.

У розныя часы гістарычнага развіцця асветнікі імкнуліся зберагчы родную мову і культуру, прымножыць яе багацце, данесці веды да шырокага кола чытачоў. Яны — гонар нашага народа, сведчанне яго цывілізацыі, культуры і адметнай самабытнасці.

Дзякуем за ўвагу!

Мы чакаем вас па адрасу:
вул. Ленінская, 2а